задачы. Арганізуюцца беларускія вучыцелі. Творацца таварыствы: апекі над дзяцьмі „Золак“, Беларускае Навуковае Таварыства[2], Беларускі Цэнтральны Саюз Нацыянальных Грамадзкіх Арганізацый[3]. У Вільні і ваколіцах адкрываюцца беларускія прытулкі для бедных дзяцей. А побач разьвіваецца выдавецкая работа: выходзіць цэлы рад кніжак для школ, літаратурных твораў, палітычных брашур і лісткоў.

Ажыўляецца шырэйшы палітычных рух — як між інтэлігенцыі, так і між рабочымі масамі. У Беларускім Клюбе адбываецца рад лекцый, рэфэратаў і гутарак на сучасныя палітычныя тэмы. Там жа 30 верасьня зьбіраецца першы публічны беларускі мітынг[4], каторы падае голас усяго арганізованага беларускага грамадзянства места Вільні і вустамі больш чым 200 прадстаўнікоў усіх кругоў і ўсіх беларускіх кірункаў высказывае палітычныя дамаганьня беларусаў. А сьледам за гэтым — як рэзультат аднадушнасьці беларусаў — ладзіцца ў Вільні Арганізацыйны Камітэт дзеля сазыву Беларускай Канфэрэнцыі[5], і ў чысьле членаў яго бачым прадстаўнікоў усіх партыйных груп і ўсіх станаў, у тым ліку беларускага каталіцкага і праваслаўнага духавенства. І ўсе яны дружна працуюць дзеля палітычнага вызваленьня нашага краю, стаптанага вайной, разарванага на часьці ваенным фронтам. Палітычныя ідэалы беларусаў прынімаюць зусім рэальныя формы і знаходзяць жывы водклік між усей краёвай дэмакратыяй.

Самы канец году прынёс нам запаведзь скорага міру[6]. І гэта дае беларусам новую энэргію да працы: яны разумеюць, што наступае для іх мамэнт правядзеньня ў жыцьцё іх нацыянальных ідэалаў, напружаюць слабеючыя ўжо ад доўгай работы рукі і напярэдадні Новага Году высказываюць веру, што цераз год — на чародным дарожным стаўпе — будуць залатымі літарамі напісаны словы:

*Воля і Незалежнасьць.*

Мы цьвёрда верым у гэта і жычым усім братам нашым з абодвых бакоў ваеннага фронту даволі сіл, каб тыя словы абярнуліся ў дзела. Мы скланяем галовы перад тымі, што доўгія гады ў цяжкім трудзе закладаў падваліны новай долі для Народу Беларускага, і клічам разам з нашым песьняром:

Дай Бог шчасьце вам і долю
Усім, хто сьлёзы праліваў,
Хто ў бедным родным полю
Зерне праўды засяваў!

## Тэзісы рэфэрату на Беларускай Канфэрэнцыі

1. Дзеля забясьпечаньня правоў беларускага народу патрэбна незалежнасьць яго Краю.
2. Беларускія і Літоўскія землі становяць адно цэлае і прыходзіцца гаварыць аб іх супольнай незалежнасьці з забясьпечаньнем аўтаномнасьці кожнай зь дзьвёх нацыянальных тэрыторый.
3. Разьдзел Беларусі ваенным фронтам паставіў кожную зь яе часьцей у іншыя варункі: землі акупацыі становяць аб’ект міжнацыянальнай палітыкі, а закардонная Беларусь — аб’ект расейскай уласьці.
4. Шанцы на незалежнасьць акупаванай Беларусі пераважываюць. У Расеі жджэ беларусаў яшчэ вострая барацьба. Незалежнае ядро з акупаваных зямель павінна паддзяржаць рух да незалежнасьці за фронтам і прыцягнуць да сябе рэшту беларускіх зямель.
5. Прашкоды ў спаўненьні гэтага: Польшча і Нямеччына[1].
6. Толькі поўная незалежнасьць і сувэрэннасьць дае надзею на злучэньне ўсіх Беларускіх зямель. На гэтым становішчы стаіць уся краёвая дэмакратыя. На гэтае становішча прызываем стануць і Канфэрэнцыю.